baj.by = baj.media

БАЖ – гэта
пра медыя.
Таму наш сайт
цяпер – baj.media

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ
## Ў БЕЛАРУСІ

№3 (77)
2024



# БЕЛАРУСКІЯ СМІ Ў МАІ – ЖНІЎНІ 2024 ГОДА. АГЛЯД

У перыяд з мая па жнівень 2024 года ў Беларусі працягваліся пераслед журналістаў і блогераў і цэнзура сродкаў масавай інфармацыі. У прыватнасці:

- Актывізаваўся ціск на супрацоўнікаў незалежных медыяпраектаў, што знаходзяцца за межамі Беларусі; іх сваякі ў Беларусі падвяргаліся ціску і запалохванню.
- Працягваўся крымінальны пераслед журналістаў як унутры краіны, так і тых, хто з'ехаў за мяжу. Завочныя суды (у парадку так званай спецыяльнай вытворчасці) над журналістамі і блогерамі, якія знаходзяцца па-за межамі краіны, набылі рэгулярны характар. На працягу мая-жніўня былі вынесеныя прысуды ў дачыненні да 9 журналістаў (да 4 з іх — завочна). https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/represii-suprac-zhurnalistau-i-medyya-u-2024-godze-spis-znyavolenyh/
- 33 медыясупрацоўнікі заставаліся за кратамі ў Беларусі. Былі вызваленыя ў выніку памілавання асуджаныя журналісты Ксенія Луцкіна, Дзмітрый Лукша і яго жонка Паліна Палавінка. https://baj.media/be/z-za-krata-vypuscili-kseniju-luckinu/ https://baj.media/be/na-voli-byly-zhurnalist-bt-dzmitryj-luksha/
- Працягвалася выкарыстанне заканадаўства аб барацьбе з экстрэмізмам для абмежавання доступу да незалежных крыніц інфармацыі. У Беларусі працягваліся затрыманні за любую форму супрацоўніцтва з «экстрэмісцкімі» незалежнымі СМІ.

- Дзяржаўныя СМІ Беларусі, з’яўляючыся сродкамі дзяржаўнай прапаганды, абыходзілі накладзеныя на іх санкцыі, у прыватнасці, парушаючы правілы трансляцыі спартыўных спаборніцтваў.

## Рэпрэсіі супраць журналістаў у эміграцыі

Журналісты, якія працуюць у выгнанні, масава станавіліся фігурантамі крымінальных спраў.

Так, 2 ліпеня ў Мінскім абласным судзе агучаныя прысуды па справе «аналітыкаў Ціханоўскай»: у парадку спецыяльнай вытворчасці былі вынесены прысуды 20 асобам, якіх Міністэрства ўнутраных спраў прызнала экстрэмісцкім фарміраваннем пад назвай «Аналітыкі Святланы Ціханоўскай». У іх ліку аказаліся журналісты беларускіх незалежных медыяў Юры Дракахруст і Ганна Любакова, яны завочна атрымалі па 10 гадоў зняволення.

2 жніўня быў абвешчаны завочны прысуд Алесю Кіркевічу. Яго прызналі вінаватым у садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці на падставе артыкула 361-4 Крымінальнага кодэкса і прыгаварылі да пазбаўлення волі на 7 гадоў, а таксама прызначылі штраф памерам 24 000 рублёў.

Справу журналіста Уладзіміра Хільмановіча ў парадку спецвытворчасці разглядаў Гродзенскі абласны суд. Журналіст быў абвінавачаны ў садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці і ва ўдзеле ў экстрэмісцкім фарміраванні (артыкулы 361-4 і 361-1 Крымінальнага кодэкса). 19 жніўня Хільмановічу было завочна прызначанае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на 5 гадоў з адбыццём ва ўмовах узмоцненага рэжыму і штрафу памерам 40 000 рублёў.

Стала вядома пра ўзбуджэнне шэрагу крымінальных спраў у дачыненні да журналістаў, якія знаходзяцца за мяжой: Намесніка старшыні БАЖ Барыса Гарэцкага, Змітра Казакевіча, Ірыны Чарняўка, Змітра Лупача, Ігара Казмерчака, Змітра Панкаўца, заснавальніка і кіраўніка Беларускага расследавальніцкага цэнтра (БРЦ) Станіслава Івашкевіча і аўтара яго відэапраграм Сяргея Чалага, а таксама траіх былых супрацоўнікаў БРЦ, а цяпер журналістаў «Бюро Медыя» Аляксандра Ярашэвіча, Аляксея Карпекі, Вольгі Альхіменка і іншых. *https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/represii-suprac-zhurnalistau-i-medyya-u-2024-godze-spis-znyavolenyh/*

Працягваўся завочны крымінальны пераслед блогераў. Так, Андрэя Павука і Вольгу Павук прызналі кіраўнікамі «экстрэмісцкага фарміравання» — аўтарскага праекта «Рудабельская паказуха». Ім прызначанае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 12 гадоў (ва ўмовах узмоцненага рэжыму) і 8 гадоў адпаведна, а таксама буйныя штрафы. Таксама за ўдзел у гэтым праекце былі асуджаныя да зняволення оперная спявачка Маргарыта Ляўчук, блогер Ілля Салянкоў і музыка Уладзіслаў Наважылаў.


Вольга и Андрэй Павук / D. Umbraso/LRT nuotr

*https://baj.media/be/zavochny-sud-nad-blogerami-rudabelskaja-pakazu-ha/*

Супраць блогера Антона Матолькі ў Беларусі распачалі крымінальную справу на падставе 13 артыкулаў. Стваральніка Telegram-канала «Беларускі Гаюн», а раней блогера-урбаніста абвінавацілі сярод іншага ў спробе захопу ўлады, экстрэмізме і здрадзе дзяржаве. *https://baj.media/be/suprac-antona-matolki-raspachali-specvytvorchasc/*


Андрэй Гнёт. Фота з асабістага архіва

Рэжысёр і журналіст Андрэй Гнёт, які супрацоўнічаў з SOS.by, прызнананым «экстрэмісцкім фарміраваннем», знаходзіцца пад пагрозай экстрадыцыі ў Беларусь на падставе рашэння Вышэйшага суда Сербіі ад 13 чэрвеня (Гнёт быў затрыманы памежнай службай Сербіі, бо знаходзіўся ў міжнародным вышуку на запыт беларускага бюро Інтэрпола). https://news.zerkalo.io/life/70659.html?tg=7

У Беларусі адбыліся 4 затрыманні журналістаў, 3 чалавекі былі пакараныя адміністрацыйнымі арыштамі.

Ціск на журналістаў, якія вымушана з’ехалі з Беларусі і працягваюць працаваць з-за мяжы, ажыццяўляўся праз вобшукі ў межах завочных крымінальных спраў па месцы іх рэгістрацыі на радзіме, праз запалохванне сваякоў і пагрозы канфіскацыі маёмасці на карысць дзяржавы (у тым ліку жылля). Так, 16 мая пасля правядзення вобшуку ў кватэры віцебскага журналіста Зміцера Казакевіча на яе быў накладзены арышт. https://baj.media/be/kvatjera-nezalezhnaga-zhurnalista/

У перыяд, што разглядаем (галоўным чынам у чэрвені-ліпені), Беларуская асацыяцыя журналістаў зафіксавала 26 ператрусаў, з іх — 21 ператрус правялі ў калег, якія выехалі за мяжу і працягваюць працу ў медыя. У абсалютнай большасці выпадкаў сілавікі прыязджалі з пастановамі наператрус па заведзеных на медыйшчыкаў крымінальных справах.

Ладзілася цкаванне ў сродках прапаганды, у прыватнасці праз знявагі і паклёп, журналістаў-эмігрантаў. 23 ліпеня сілавікі паведамілі, што завялі крымінальныя справы ў дачыненні да дзвюх вядоўцаў TikTok-канала выдання «Зеркало», і прымусілі іхніх бацькоў запісаць відэа са словамі асуджэння на адрас сваіх дзяцей. https://nashaniva.com/347649

## Выкарыстанне «антыэкстрэмісцкага» заканадаўства для пераследу за распаўсюд «забароненай» інфармацыі — кантэнту незалежных СМІ і апазіцыйных рэсурсаў

Чарговыя тры медыяпраекты былі прызнаныя экстрэмісцкімі фарміраваннямі — гэта Orsha.eu, Media IQ і «Обычное утро». Да таго ж экстрэмісцкімі фарміраваннямі абвешчаныя інтэрнэт-рэсурсы «Мы не Холопы», «Народны рэпарцёр» (праект экс-палітзняволеных блогераў Аляксандра Кабанава і Сяргея Пятрухіна), а таксама сацсеткі блогера Алега Жалнова. https://www.mvd.gov.by/ru/news/8642

Шматлікія анлайн-крыніцы і публікацыі прызнаваліся экстрэмісцкімі матэрыяламі, найчасцей апазіцыйныя і медыйныя Instagram і TikTok-акаўнты. Як і раней ажыццяўляўся адміністрацыйны пераслед за распаўсюд інфармацыі, прызнанай «экстрэмісцкай».

Упершыню з’явілася інфармацыя пра ўзбуджэнне крымінальнай справы па абвінавачанні ў садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці за адзіны рэпост навіны з сайта «экстрэмісцкага фарміравання». Раней гэта зазвычай кваліфікавалася як адміністрацыйнае правапарушэнне. У ГУБАЗіК заявілі: «Хапіла адзінай перасылкі ў публічныя чаты навіны, раней апублікаванай экстрэмісцкім фарміраваннем, каб узбудзіць крымінальную справу па арт. 361-4 КК Беларусі. Цяпер такая правільная практыка будзе пастаўлена на паток, і падобныя наўмысныя дзеянні будуць строга карацца». *https://news.zerkalo.io/life/67689.html?tg=9*

Асуджаныя да пазбаўлення волі журналісты Аляксандр Зянкоў, Ігар Карней, Алесь Марчанка, Алена Цімашчук, Аляксандр Кіркевіч (асуджаны завочна), а таксама блогер Аляксандр Ігнацюк унесеныя ў Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян альбо асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці. *https://www.mvd.gov.by/ru/news/8642*

# Блакіроўка анлайн-рэсурсаў

Міністэрствам інфармацыі і іншымі дзяржаўнымі структурамі ажыццяўлялася абмежаванне доступу да «непажаданай» інфармацыі праз цэнзурныя абмежаванні.

Мінінфарм абмежаваў доступ да сайтаў baranovichi24.by (з прычыны наяўнасці гіперспасылкі на «экстрэмісцкае» СМІ) і Katolik.life (без паведамлення прычын). Апошні яшчэ раней быў заблакаваны ў Расіі, верагодна, праз тое, што на ім закраналася тэма вайны ва Украіне. *https://mediazonaby.com/news/2024/06/21/baranovichi*

*https://katolik.life/bel/news/sotsium/item/5451-khrystsiyanski-praekt-zablakavali-belarusi-i-rf-chamu-i-shto-z-getym-rabits.html*


Фота: Kaboompics.com / pexels.com

Дзяржаўны тэлеканал «Сталічнае тэлебачанне» (СТВ) падвергнуў цэнзуры трансляцыю чэмпіянату Еўропы па футболе, у апошні момант адмовіўшыся ад паказу ў Беларусі матчаў зборнай Украіны, якія ўжо былі ўключаныя ў праграму перадач. https://euroradio.fm/u-belarusi-ne-pakazhuc-match-eura-2024-z-udzelam-zbornay-ukrainy

Стаў недасяжным для наведнікаў архіў сайта холдынгу «Культура і Мастацтва». Тут была сабраная ўся гісторыя беларускага мастацтва ад пачатку XXI стагоддзя, у тым ліку неафіцыйнага, але шмат якія героі публікацый апынуліся ў турме альбо ў эміграцыі і іх творчасць не адпавядае цяперашнім ідэалагічным установкам. https://baj.media/be/kultura-i-mastactva-stau-nedasjazhnym-dlja-navedvalnikau/

25 чэрвеня ў адказ на блакіроўку Еўрасаюзам шэрагу расійскіх СМІ ў Расіі заблакавалі тэлеканал «Белсат» (сярод іншых замежных медыя https://baj.media/be/u-rasii-zablakavali-belsat/

## Падзеі ў дзяржаўным медыясектары

Міністэрства інфармацыі дапоўніла пералік спартыўных спаборніцтваў, якія ў Беларусі можна паказваць без згоды праваўладальнікаў — гэта матчы Лігі нацый і таварыскія матчы з удзелам зборнай Беларусі па футболе. Іх дазволілі паказваць без згоды УЕФА. https://baj.media/be/mininform-razreshil-piratskij-po-kaz-matchej-ligi-nacij-i-tovarishheskih-matchej-sbornoj-po-futbolu/


Фота: Dušan Cvetanović / pexels.com

5 жніўня Еўрасаюз увёў новыя санкцыі супраць беларускіх сілавікоў і прапагандыстаў, у санкцыйны пералік патрапілі генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва БелТА Ірына Акуловіч, экс-кіраўнік прэс-службы Аляксандра Лукашэнкі Дзмітрый Жук і вядоўца тэлепраграмы «Сенат» на канале «Сталічнае тэлебачанне» Мікіта Рачылоўскі. Міністэрства інфармацыі Беларусі ў адпаведнай заяве таго ж дня назвала гэтыя санкцыі «найгрубейшым парушэннем нормаў міжнароднага права». *https://www.consilium.europa.eu/en/press/press-releases/2024/08/05/belarus-eu-lists-further-28-individuals-for-participation-in-internal-repression*/

БЕЛАРУСКАЯ
АСАЦЫЯЦЫЯ
ЖУРНАЛІСТАЎ

baj.media

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Бастунец Андрэй

E-mail: office@baj.media
Web: https://baj.media

2024